## НЕЗАБЫЎНАЕ

Працяг са старонкі 11 >

*...Два гэпэвушнікі палезьлі (пад нары) да Макарэнкаў і сталі цягнуць іх за ногі... Тыя небаракі-сьмяротнікі паднялі такі крык і лямант, што ўсю камеру кінула ў дрыжыкі... Не памаглі ні крык, ні хапаньне рукамі за цэмэнт, за нары. Павалаклі...*

З успамінаў Міколы Хведаровіча, аднoўленых Янкам Брылём (падзеі, якія ў іх апісваюцца, адбываліся ў пачатку жніўня 1938 года):

*Камера на дзесяць чалавек, а нас там каля сотні. Мокрыя ад поту, у адных трусах, ляжым проста адзін на адным.*

*А параша саракавядзёрная ажно брадзіць пачынае ад гарачыні. Уранні наглядчык адчыніць дзверы, а сам набок, каб духам з ног не збіла!*

Урывак з дзённіка К.Чорнага (запіс ад 3 кастрычніка 1944 года):

*У яжоўскай турме (у камеры-адзіночцы) увосень 1938 мяне саджалі на кол, білі вялікім жалезным ключом па галаве і палівалі збітае месца халоднай вадой, паднімалі і кідалі на рэйку, білі паленам па голым жываце, устаўлялі ў вушы папяровыя трубы і раўлі ў іх ва ўсё горла...*

У падвалах ГПУ-НКВД чамусьці заўсёды было нясцерпна горача і моташна смуродна, але рэдка ціха і «сумна». Асабліва ноччу. То закрычыць ад болю падследны, які яшчэ не страціў свядомасці ад катаванняў, то пранясецца па турме роспачны лямант звар'яцелага за хвіліну да смерці бедалагі, прыгаворанага да расстрэлу, якога выцягваюць, вырываюць з камеры, а ён чапляецца з апошніх сіл за нары і жыццё. То рэха пісталетнага стрэлу адразу сотням пакутнікаў прымусіць задаць сабе адно і тое самае пытанне: «Хто наступны?»

У падвалах ГПУ-НКВД чамусьці заўсёды было нясцерпна горача і моташна смуродна, але рэдка ціха і «сумна».

Хто наступны?

### Пахаванне

Чытаю ва ўспамінах паэта і добрага, сумленнага, не зламанага жахлівым лёсам чалавека, былога вязня сталінскіх канцлагераў Паўла Пруднікава: «На пахаванні Уладзіміра Дубоўкі нас было толькі пяць чалавек. Саюз пісьменнікаў СССР прадстаўляла Валянціна Шчадрына — кансультант па беларускай літаратуры, Мікола Гамолка і я — ад беларускай пісьменніцкай арганізацыі, пляменнік нябожчыка Валодзя і дачка яго даўняга сябра Адама Бабарэкі — Алеся. Вось і ўсё».

Усё, ды не ўсё. Нядаўна, Павел Іванавіч, мы хавалі вас. Былі Сяргей Законнікаў ад «Полымя», Алесь Пісьмянкоў ад «ЛіМа», Навум Гальпяровіч ад Саюза пісьменнікаў, ад «Маладосці», іншых выданняў — усіх не пералічыць.

Паміраць дома, на сваёй зямлі, — больш пачэсна. Цябе праводзяць у апошні шлях сябры, таварышы, чытачы, землякі. А каму патрэбны беларусы на чужыне?

Але Дубоўка выбраў чужыну. Ён баяўся сваіх.

## МАЛІТВА ЗА РЭПРАСАВАНЫХ — НЯВІННА ЗАБІТЫХ



У імя Айца, і Сына, і Святога Духа. Госпадзе Ісусе Хрысце, Божа Наш, Ты сам быў бязвінна рэпрасаваны, пакутаваў, распяты на крыжы, глянь ласкавым вокам на загінулых ад бязбожнай улады пры дэспаце Сталіне, на пакутнікаў, якія ў Курапатах-Бродзе, Кальварыі і Цівалях, Благоўшчыне і Лошыцы, лесапарку Ваньковічаў-Чалюскінцаў, Цагельні ды іншых лясных урочышчах Беларусі і за межамі Бацькаўшчыны нашай, у турмах, канцлагерах, псіхічных засценках аж да тундры і Сібіры скончылі свой зямны шлях у невядомых і вядомых, забытых і занядбаных магілах.

Ойча Наш Нябесны! Успомні з вераю і надзеяю на вечнае жыццё ахвяраў — нявінна рэпрасаваных, замучаных, забітых, расстраляных, утопленых антыхрыстамі, і як добры і чалавекалюбец, Які выбачае грахі, даруй пакутнікам нашым усе іхнія свядомыя і несвядомыя правіны.

Магутны Божа, залічы у лік сваіх шчаслівых слугаў усіх замучаных і расстраляных, што палеглі як на полі бою з бязбожнаю антыбеларускаю ўладаю. Яны прайшлі пакутны і цярністы шлях жыцця і сваёю смерцяю далі сапраўднае пасведчанне святасці Тваёй.

Госпадзе Ісусе Хрысце, Сыне Божы, Чалавекалюбец і Збаўца Наш, дзеля малітваў Маці Тваёй і ўсіх беларускіх святых, памілуй іх. Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, памілуй іх.

Валадару і Суцяшальніку Наш! Злучы іхнюю крывавую ахвяру са сваёй крыжоваю. Няхай жа ня будзе дарэмнаю тая іхняя ахвяра, і няхай на залітай крывёю зямлі нашай больш ня будзе такога гвалту і здзеку,

і няхай у нас закрасуе братняя любоў і свеціць сонца волі і шчаснай долі народу нашаму і веры нашай.

Слава Айцу, і Сыну, і Святому Духу, цяпер і на ўвесь час, і на вякі вечныя. Амін.

*Пратаярэй БАПЦ*
*айцец **Леанід Акаловіч***

**Інфармацыйны бюлетэнь Аргаміэта Года Памяці.**
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі і друкуюцца дзеля палемікі.
Наклад **299** экз.

Адказны за выпуск **Васіль Якавенка**, yakavenka@list.ru.
Рэдактар нумара **Уладзімір Халіп**. Вёрстка **Яраслаў Мальдзіс**.
Адрас для пісем: **220134, Мінск-134, п/с 82, Андросік Ларысе.**
Мабільныя тэлефоны: **8 (029) 634-50-78, 776-77-13.**

Рэха ГУЛАГу
БЮЛЕТЭНЬ АРГКАМІТЭТА ГОДА ПАМЯЦІ
№6 кастрычнік 2007
Не патушы свечку памяці...

## СТАЛІ АХВЯРАМІ

# У СВІНЦОВУЮ ЗАМЯЦЬ

**20-я гады, калі ў Беларусі разам з аднаўленнем народнай гаспадаркі актыўна ішло нацыянальна-культурнае будаўніцтва, былі адносна спакойнымі і самымі творчымі ў жыцці М. Гарэцкага, хаця на пачатку 1922 г. ён быў арыштаваны польскімі ўладамі і ненадоўга пасаджаны ў Лукішкі (турма ў Вільні) за пракамуністычную дзейнасць. Але ўжо ў канцы 20-х гадоў у БССР пачынаюцца абвінавачванні многіх пісьменнікаў у «кулацкіх тэорыях», «антыпартыйных поглядах», «нацыяналістычнай абмежаванасці», «буржуазнай нацдэмаўшчыне».**




Максім Гарэцкі ў турме. 1930 г.

18 ліпеня 1930 года на аснове пастановы, падпісанай старшым упаўнаважаным 2-га аддзела СА Сікорскім, узгодненай з начальнікам СА ПП АДПУ БВА Агровым і зацверджанай намеснікам ПП АДПУ БВА Рапапортам, і ордэра № 78 супрацоўнік АДПУ Лукоўскі правёў вобыск на кватэры (Менск, вул. Заслаўская, д. 16, кв. 2), канфіскаваў розную перапіску, шэраг кніг і арыштаваў Максіма Гарэцкага.

Я падлічыў, што М. Гарэцкаму давялося пражыць у больш-менш нармальных умовах усяго каля 13 год.

Працяг на старонцы 2 >

## ЗВАРОТ



Паважаныя суайчыннікі!

20 стагоддзе стала для беларускага народу часам як здабыцця дзяржаўнай незалежнасці і перамогі над нацызмам, так і велізарных ахвяраў, выкліканых злачынствамі таталітарных рэжымаў.

Наш народ — гэта супольнасць людзей, што жылі, жывуць і будуць жыць на беларускай зямлі. Любы народ моцны тым, што ён ганарыцца здзяйсненнямі і памятае пра трагічныя моманты нацыянальнай гісторыі. Гістарычная праўда і пакаянне за злачынствы — гэта галоўная зарука таго, што на нашай зямлі больш не будзе глебы для прыніжэння чалавечай годнасці, для чалавечай нянавісці, здрады ды помсты.

Ведаючы і памятаючы пра злачынствы нацызму, мы як нацыя павінны не забывацца на гістарычную памяць, ахвяраў і злачынствы камунізму на беларускай зямлі. Сотні тысячаў беларусаў патрапілі ў жорны бальшавіцкіх масавых рэпрэсіяў, у якіх мэтанакіравана знішчалі як нацыянальную эліту, так і простых людзей. Кожны беларус мае ведаць і памятаць пра пакуты і ахвяры сваёй сям'і, свайго роду і сваёй нацыі.

Для пабудовы лепшай будучыні нам неабходная гістарычная праўда. Пераканаы, што сённяшні перaслед і рэпрэсіі супраць іншадумцаў ёсць частковае паўтарэнне ранейшых мадэляў і метадаў. Яны былі б немагчымыя, калі б мы ўсе памяталі і шанавалі памяць герояў і ахвяраў барацьбы супраць савецкага таталітарызму.

Заклікаю ўсіх беларусаў далучыцца да урачыста-жалобных мерапрыемстваў Дня памяці 29 кастрычніка. Згадайма нашых продкаў, загінулых і пацярпелых ад таталітарнай сістэмы.

***Аляксандр Мілінкевіч***

## АКЦЫЯ

# ЗАПАЛІМ СВЕЧКІ НА ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ!

Шаноўныя суайчыннікі!

Не забывайма, што 29 кастрычніка — Дзень Памяці ахвяраў сталінскі рэпрэсій!

Менавіта ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў падвалах мінскай турмы замучаны і расстраляны відныя дзеячы культуры, асветы і дзяржаўнага апарата. Гурма — каля 100 чалавек. А ўсяго за гады бальшавіцкага ліхалецця рэпрасавана больш за 1,5 мільёна лепшых нашых суайчыннікаў.

Аргкамітэт Года Памяці паведамляе, што ў панядзелак 29 кастрычніка на Мемарыяльным комплексе Курапаты пад Мінскам адбудзецца мітынг-рэквіем. Пачатак ў 16.30.

Аргкамітэт заклікае прыняць удзел у мітынгу-рэквіеме. Апроч таго, у гэты ж дзень, ужо дома, перад наступленнем ночы запалім свечкі памяці!

Ушануем памяць незлічоных пакутнікаў нашых хвілінай маўчання, сваім болем, добрым словам, малітвай.

Тэлефон для кантактаў: Velcom 29 613 60 87, МТС 29 276 37 06. E-mail: represii@bchd.info. Http://represii.bchd.info/god_pamiaci/

СТАЛІ АХВЯРАМІ

# У СВІНЦОВУЮ ЗАМЯЦЬ

Працяг са старонкі 1 >

Гэта багацькаўска-горацкі, віленскі, менска-горацка-менскі перыяды яго творчасці і жыцця, у якія ён змог напісаць свае асноўныя мастацкія і навуковыя творы. Але і ў турме ў Менску і потым у ссылцы ён не пакідаў пяро і пісаў. Ён скончыў «Віленскія камунараў» і значна папрацаваў над «Камароўскай хронікай». А колькі б мог зрабіць пісьменнік пры іншых абставінах?!

М. Гарэцкі праходзіў па справе Саюза вызвалення Беларусі, а Г. Гарэцкі — па справе Працоўнай сялянскай партыі, хаця абодва лічыліся ўдзельнікамі і той і другой арганізацыі. Як стала вядома цяпер, справы былі выдуманы, але 10 красавіка 1931 г. (у дзень нараджэння Гаўрылы) Максім быў прыгавораны да 5 гадоў высылкі ў Вятку (затым г. Кіраў). Г. Гарэцкі ў траўні 1931 г. быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання, якая затым была заменена на 10 гадоў лагераў.

Так абодва браты трапілі ў «архіпелаг ГУЛАГ».

У Вятцы М. Гарэцкі год жыў адзін, а потым, з чэрвеня 1932 г., разам з сям'ёй. Як успамінае Л. Чарняўская, «жылося цяжка. Працавалі мы абое многа, а дастатку не было. Стамляліся, нерваваліся…; для Максіма становішча ссыльнага было маральна цяжкім. Штотыдзень ён хадзіў на рэгістрацыю ў камендатуру».

У сумнавядомы 1937 год — год найбольшага ўздыму сталінскіх рэпрэсій — дабіралі «недабітых» у мінулыя гады «ворагаў народа» і «шпіёнаў». Былі створаны так званыя «тройкі», якія надзяляліся асобымі паўнамоцтвамі і выносілі канчатковыя прысуды.

### АКТ

*1938 года, февраля 10-го дня*

Мы, нижеподписавшиеся, Начальник Особой Оперативной группы Управления НКВД СССР Смоленской области — Старший Лейтенант Милиции…, Врид Коменданта Управления НКВД СССР Смоленской области — Младший Лейтенант Государственной безопасности… и Помощник Коменданта Управления НКВД Смоленской области… сего числа, на основании предписания Зам. Нач. Управления НКВД СССР Смоленскай области — Капитана Государственной Безопасности тов. ВИКТОРОВА от 28-го января 1938 года за № 60253/8Б привели в исполнение решение Заседания Тройки УНКВД Смоленской области от 5-го января 1938 года (протокол № 85) в отношении осужденных к расстрелу:

…30. ГОРЕЦКОГО Максима Ивановича…

Перечисленные осужденные, всего в числе сорока человек, из места содержания под стражей были взяты в 14 часов 45 минут 10-го февраля 1938 года, а решение Заседания Тройки приведено в исполнение путем расстрела в 15 часов того же 10-го февраля 1938 года.

Трупы зарыты на установленную глубину, о чем и составлен настоящий акт в одном экземпляре.

НАЧ. ОСОБОЙ ГРУППЫ УНКВД СМОЛЕНСКОЙ ОБЛАСТИ — СТАРШИЙ ЛЕЙТЕНАНТ МИЛИЦИИ

(подпись)»



Максім Гарэцкі з жонкай Л. У. Чарняўскай-Гарэцкай і дзецьмі Леанідам і Галінай. 1923 г.

Разам з гэтым ніжэй пастаўлены яшчэ два подпісы.

З акта бачна, што за 15 хвілін добрасpractыкаваныя служакі НКУС паспелі вывесці з турмы 40 чалавек, усіх расстраляць, а затым і закапаць на «адпаведную глыбіню».

Сярод расстраляных усе, апрача М. Гарэцкага, жыхары вясковай мясцовасці (галоўным чынам сяляне — калгаснікі, а таксама настаўнік, вартаўнік, загадчык магазіна, рахункавод і інш.), узростам ад 20 да 70 гадоў.

Як высветліў М. М. Ількевіч, 25 студзеня 1938 г. адбыліся чатыры пасяджэнні «тройкі» пры УНКУС Смаленскай вобласці і адпаведна складзены чатыры пратаколы: № 84, 85, 86 і 87. Выніковыя лічбы за адзін «працоўны» дзень «тройкі»: разгледжана 406 спраў, па якіх абвінавачаны 923 чалавекі; з іх 587 прысуджаны да расстрэлу. Вось так па-ўдарнаму працавала «самая передовая и справедливая в мире» сталінская судовая сістэма па генацыду беларускага народа!

Старшынстваваў на ўсіх чатырох пасяджэннях «тройкі» А. А. Наседкін — начальнік Упраўлення НКУС Смаленскай вобласці. У далейшым Наседкін стаў наркомам унутраных спраў БССР, затым быў арыштаваны і ў 1940 г. расстраляны. Ён на допытах паказаў: «… За 1937 год Каруцким (былы начальнік — да Наседкіна. — *Р. Г.*) и мною по Смоленской области было арестовано 12 000 человек, из них осуждено по первой категории (расстрэл. — *Р. Г.*) 4 500 человек. Среди репрессированных и осужденных было большое количество совершенно невинных людей… По инициативе Викторова и Каруцкого была организована группа «постоянных свидетелей» для фиктивных изобличающих показаний. Как метод ведения следствия Викторов ввел электропытку и массовое избиение арестованных».

*З кнігі: Радзім Гарэцкі. Ахвярую сваім «Я»… Мінск: Беларуская навука, 1998.*



Гаўрыла Гарэцкі ў турме. 1930 г.



НЕ ПАДЛЯГАЕ ЗАБЫЦЦЮ

# ЛОШЫЦА — МЕСЦА БАЛЬШАВІЦКІХ РАССТРЭЛАЎ

**Горад Менск — своеасаблівы мартыралог. І пачаў ён сваю летапісную гісторыю ў 1067 годзе ад запісу ў летапісе пра яго поўнае зьнішчэньне.**

**Перыяд бальшавіцкай акупацыі таксама быў бязьлітасны. Горад выглядаў своеасаблівай фабрыкай сьмерці. Акрамя Курапатаў тут было яшчэ каля дзясятка месцаў, дзе адбываліся масавыя расстрэлы. Страляніна тут гучэла кожную ноч на працягу многіх гадоў. Стралялі ў патыліцу камуністычным ахвярам. Іх звозілі ў Менск адусюль. Расстрэльвалі ў Курапатах, у лесе Ваньковіча (цяперашні парк Чалюскінцаў у цэнтры Менска).**

Некалькі гадоў назад Беларускі Народны Фронт паставіў тут крыж. Потым расстрэльвалі на ўсход ад лесу Ваньковіча кіламетраў за 5–7 па Барысаўскім тракце. У пачатку 60-х гадоў пахаваньні выявілі тут пры пракладцы дарогі. Рэшткі расстраляных былі зьнішчаны пры ўдзеле КДБ.

У гэтым жа раёне (леса Ваньковіча і Сьцяпянкі) знаходзілася злавесная дача Цанавы (кіраўніка НКВД на Беларусі). Тут таксама пастаянна расстрэльвалі. Дзе жылі там і забівалі. Там і закопвалі.

Расстрэльвалі таксама ў лесе ля вёскі Дроздава каля Курапатаў і тут жа побач у мясцовасьці Інтэрбуршчына каля вёскі Баравая, далей — у Зацені. Пасьля вайны ўканцы саракавых бальшавікі расстрэльвалі людзей за Менскай Кальварыяй па дарозе на Ракаў і далей у раёне Кунцаўшчыны. Яшчэ далей ля вёскі Тарасава ў чэрвені 1941 года энкавэдзісты расстралялі некалькі сот палітвязьняў.

На працягу ўсяго 1937 года кожны дзень забівалі людзей у глыбокіх ярах каля вёскі Лошыца, што за Камвольным камбінатам на ўскраіне Менска. Мясцовыя людзі памяталі і ведалі пра гэтыя забойствы.

У 1988 годзе я некалькі разоў размаўляў са сьведкам лошыцкіх расстрэлаў спадарыняй Верай Шумскай (аўдыёзапіс гутаркі захоўваецца), якой тады ўжо ішоў дзявяты дзясятак. Людзей прывозілі на грузавіках, рукі іх былі закручаны назад і зьвязаны дротам. Прывозілі, як правіла, рана на сьвітаньні. Энкавэдзісты асабліва не хаваліся. У расстрэлах бралі таксама ўдзел мясцовыя камуністычныя актывісты, стукачы і падонкі, якім проста хацелася пастраляць у чалавека. Гэтакім актывістам плацілі за расстрэл 50 капеек. За тыдзень такі энтузіяст мог зарабіць на бутэльку гарэлкі. Энкавэдзісты выхваляліся, што пускаюць у расход «врагов народа». Расстраляных закопвалі ў вялікіх ямах, як і ў Курапатах.

У 1988 годзе ў час археалагічных дасьледваньняў Курапатаў я вырашыў аднача́сна дасьледваць Лошыцу. Калі я прыехаў сюды з камандай археолагаў, я не паверыў сваім вачам… Яроў не было. Не было вялікіх марэнных узгоркаў, на якіх раней рос яблыневы сад. Не было і саду. Яры плошчай каля трох га былі засыпаны мокрым галечным жвірам і ўтрамбаваны катком. Узгоркі ссунуты бульдозерам у яры, сад высечаны, яблыневыя дрэвы сьцягнуты ў кучы.

За паўкілометра — кантора прыгараднага калгаса. Старшыня быў вельмі зьдзіўлены, калі даведаўся, што яры засыпаны. Яшчэ два тыдні назад яны былі. Нехта прарабіў тытанічную працу. Потым я даведаўся, што некалькі месяцаў назад гэтую тэрыторыю забралі ў калгаса і перадалі ў валоданьне гораду Менску. Горад хуценька пачаў тут рабіць стаянку для машын (на яме, на касьцях). Цяпер гэта ўсё пакрыта асфальтам, стаяць аўтамабілі, пабудавана прахадная, у якой сядзіць вечны адстаўнік, былы палкоўнік Савецкай Арміі, і правярае дакументы.




Я яшчэ раз пераканаўся ў магутнасьці КДБ. Трэба — дык і горы скапаюць, і рэкі засыплюць. На гэты раз яны пасьпелі. Дасьледаваць лошыцкія магілы практычна ўжо немагчыма. Засталіся толькі галасы сьведкаў на магнітнай стужцы і Боскі суд для забойцаў наперадзе.

У 1995 годзе на Дзень Задушны і Дзяды актывісты Беларускага Народнага Фронту паставілі тут вялікі драўляны крыж і сьвятары асьвяцілі яго з малітвай. Такіх месцаў, як Курапаты, як Лошыца надзвычай шмат на Беларусі. Мы пра іх ведаем і памятаем пра генацыд.

***Зянон Пазьняк.** 1997 г.*

НЕЗАБЫЎНАЕ

# ЗАЦЕМКІ

З кнігі Леаніда Маракова «Непамяркоўныя»

## *Хто наступны?*

З успамінаў Міхася Кавыля «Казённы дом і далёкая дарога» (падзеі, якія ў ёй апісваюцца, у канцы красавіка 1933 года):

*…із камеры дыхнула такім смуродам, што ледзь утрымаўся на нагах. Як п'яны апусціўся тут жа каля дзвярэй на нары, паміж нечых худых, як у рахітыка, ног. Паглядзеў на вялікую камеру. На нарах, на цэментовай падлозе адзін каля аднаго ляжалі, хто на баку, хто на сьпіне, нейкія стварэньні із Дантавага «аду».*

*…Неўзабаве пасля гэтай страшнай ночы мяне, каб не ганяць «чорны воран» па Менску, перакінулі із вастрогу ў «страшны дом» на Савецкай вуліцы, бліжэй да сьледчых. У камеры ляжалі голыя на цэмэньце Зьмітрок Паваротны і Чарняўскі, імя не памятаю…*

Працяг на старонцы 12 >

**ЛІСТАВАННЕ**

*Рэспубліка Беларусь*

*Мінск:*

Генеральнаму пракурору ***П. П. Міклашэвічу***

Кіраўніку справамі Адміністрацыі Прэзідэнта ***Г. М. Нявыгласу***

Міністру унутраных спраў ***У. У. Навумаву***

Міністру культуры ***У. Ф. Мацвейчуку***

Старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі ***Ю. В. Жадобіну***

Старшыні Мінгарвыканкама ***М. Я. Паўлаву***

# АДКРЫТЫ ЛІСТ

Зноў вандалізм! На нацыянальным могільніку беларусаў — гісторыка- культурным комплексе «Курапаты», які мае вельмі сумную сусветную славу, знявечаны, паламаны на кавалкі асноўны крыж!

Ніякія выпадковыя хуліганы не маглі ўчыніць такое ў чарговы раз.

Злачынства загадзя спланавана і падрыхтавана, відавочна, у якасці контрмеры да тых мерапрыемстваў, якія праводзяцца грамадскасцю напярэдадні Дня Памяці — 29 кастрычніка, дня, калі 70 год таму у Мінску за адну толькі ноч былі расстраляны каля сотні вядомых пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў.

Чаму маўчыць улада? Калі маўчыць, то ці не з яе ж баславення дзікунства тое і робіцца?

Няўжо яе шматлікія спецслужбы не ў стане выявіць тых, хто ўпарта і няспынна зневажае ліхі россып магіл — апошні прытулак соцень тысяч найлепшых сыноў і дачок Рэспублікі Беларусь.

Ужо не дзівіць болей і цынізм мясцовых службовых асоб. Бараўлянская міліцыя, напрыклад, у адказ на чарговы наш зварот на пачатку 2007 года, калі была паламана Лаўка Клінтана, спасылалася на інфармацыю Міністэрства культуры, паводле якой у Дяржаўны спіс гістарычных і культурных каштоўнасцей «уключана месца пахавання ахвяраў палітычных рэпрэсій 30–40-х гадоў у якасці гістарычнай каштоўнасці першай катэгорыі без вызначэння якіх-небудзь дадатковых элементаў ва ўрочышчы Курапаты». Вось як! Крыж не ўнесены ў спіс, і таму яго трэба ламаць? А тое, што ўсё ўсталяванае на месцы пахавання шматлікіх ахвяраў на тэрыторыі гэтага гісторыка-культурнага комплексу з'яўляецца недатыкальным і павінна ахоўвацца дзяржавай, не бярэцца пад увагу чыноўнікамі. Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» не выконваецца. Сумленне службоўцаў не запатрабавана, грамадзянскі абавязак, гонар краіны, памяць і боль народа ў грош не ставяцца!

З такімі ж адносінамі да ахвяраў крыважэрнага рэжыму, дазвольце зазначыць, краіна не мае будучыні. І дзе тыя вандалы?.. Яны сярод нас?.. Калі адсякаецца памяць народа, то самі ж мы спакваля, паціху, памалу і ператвараемся (альбо ператворымся) ў вандалаў. Тут жарты дрэнныя.

У чарговы раз, выступаючы ад імя грамадскасці, мы патрабуем ад улад і сілавых структур краіны безумоўнага выканання імі сваіх прамых абавязкаў.

Мы патрабуем яшчэ раз: неадкладна забяспечце захаванне гісторыка-культурнага комплексу «Курапаты» разам з усімі элементамі ўшанавання і ўвекавечання памяці нявінна палеглых там суайчыннікаў нашых!

Мы патрабуем правесці грунтоўнае расследаванне ўчыненых у Курапатах актаў злоснага вандалізму і прыцягнуць вінаватых да крымінальнай адказнасці. Спыніце здзек над памяццю ахвяраў небывалага ў свеце генацыду, масавага вынішчэння людзей, занядбання і вынішчэння гісторыі і культуры беларускага народа.

Мы хадайнічаем перад Міністэрствам культуры краіны перагледзець Дяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей і, у адпаведнасці з Законам аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, артыкулы 21 (пункт 5) і 22, пашырыць пералік каштоўнасцей на месцы згубы ахвяраў палітычных рэпрэсій (Курапаты), унёсшы ў пералік не адно «месца згубы», але і такія кампаненты як шэраг крыжоў і памятных камянёў, як Лаўка Клінтана...

І, нарэшце, скажам вандалам розных масцей: панове, памейце сорам, пакіньце памяць пра мёртвых у спакоі! Годзе весці з мёртвымі грамадзянскую вайну! Дый з жывымі — таксама.

Ад Аргкамітэта па ўшанаванні памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій:

***Радзім Гарэцкі***, геолаг, акадэмік

***Ігар Кузняцоў***, гісторык

***Васіль Якавенка***, пісьменнік

Старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства Аховы помнікаў гісторыі і культуры ***Антон Астаповіч***

Старшыня ГА «Хрысціянская злучнасць «Курапаты» ***Вацлаў Нямковіч***

*19 кастрычніка 2007 г.*



**НЕ ПАДЛЯГАЕ ЗАБЫЦЦЮ**

# НЯ МАЕМ ПРАВА ЗАБЫЦЬ

**Беларусь. Мінск. Амаль самая ўскраіна горада. Каля кальцавой дарогі і аднаго са сталічных мікраараёнаў «Зялёны луг» — лясны масіў. Паўсюль высокія, але яшчэ адносна маладыя сосны. У вочы адразу кідаецца няроўнасць зямлі і жоўты пясок на паверхні глебы.**

Позна ўвечары і ўначы, калі цемра паглынае горад, у гэтым, здаецца, звычайным сасновым лесе, можна пачуць трохі прыглушаныя людскія галасы, крыкі і стогны, а самае балючае — плач — жаночы і нават дзіцячы. Асабліва ўвосень, у кастрычніцкія халодныя дні, гэтыя незвычайныя гукі пачынаюць узнікаць усё часцей і часцей. Адчуванне неверагоднага духоўнага болю і драматызму суправаджае гэтае месца. Калі ж ведаеш гісторыю, прыходзіць разуменне той трагічнай атмасферы, што пануе тут. Гэтае месца з'яўляецца нацыянальным некропалем нашай краіны і мае назву «Курапаты». А гукі, што часам чуюцца тут — гэта галасы нявінных ахвяраў камуністычнага тэрору. У гэтай зямлі ляжаць больш за дзвесце тысячаў бязвінных людзей, што былі забітыя толькі за тое, што яны з'яўляліся беларусамі. Такіх масавых пахаванняў на тэрыторыі нашай шматпакутнай Бацькаўшчыны незлічоная колькасць. Большасць з іх, дзякуючы стараннем забойцаў, застаюцца дакладна невядомымі і зараз. Карнікі не пакідаюць пасля сябе сведчанняў і сведкаў.

Злачынствы камунізму на Беларусі можна з жахам пачынаць пералічваць яшчэ з першых дзён панавання савецкай улады на нашай зямлі. Гэта стала працягам ранейшай палітыкі імперскай Расіі, накіраванай на знішчэнне беларускай нацыі. Але тады гэта быў толькі пачатак. Мэтанакіраванае вынішчэнне нашай культуры, нашай бацькоўскай спадчыны, нашай рэлігіі, рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі ў рэшце рэшт пераўтварыліся ў адкрыты генацыд беларускага народа. Свайго апагею крывавы тэрор дасягнуў у 1937-ым годзе. Спачатку масавыя ссылкі у савецкія канцлагеры, а пасля забойствы людзей адбываліся ледзь не штодзень. Антычалавечая машына рэпрэсій разгарнулася па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Грамадства было цалкам прасычанае пачуццямі жаху і страху за заўтрашні дзень. Дзеля псіхалагічнага знішчэння людзей была распрацаваная жудасная сістэма даносаў. НКУС і Камуністычная партыя выконвалі план па злачынствах, які прыходзіў з Масквы. Карнікі не шкадавалі ні дзяцей, ні жанчынаў, ні старых людзей. Восень 1937-га ўвайшла ў гісторыю нашага народа адной з самых крывавых датаў, 29-ым кастрычніцкім днём. У гэты чорны дзень толькі за адну ноч ворганамі НКУС было растраляна 100 беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, журналістаў і грамадскіх дзеячаў. Былі забітыя лепшыя з лепшых сыноў і дачок нашай Бацькаўшчыны. Бязлітасная машына тэрору была адмыслова накіраваная на эліту беларускага народа. Гэта была трагедыя, пакінуўшая ў гісторыі Беларусі проста жахлівы след, які мы можам адчуць і зараз. Асабліва балючым ёсць усведамленне тых фактаў з гісторыі, якія сведчаць аб тым, як па-звярынаму сталінскія карнікі распраўляліся з будучыняй нашага народу, з беларускай моладдзю. Таталітарны рэжым не меў літасці ні да каго. Простыя беларускія юнакі і дзяўчаты былі асуджаныя ад велізарных турэмных тэрмінаў да вышэйшай меры пакарання. За час панавання камуністычнага рэжыму цэлыя пакаленні беларусаў свае лепшыя маладыя гады правялі ў канцэнтрацыйных лагерах і турмах. Сённяшняй моладзі нават цяжка ўявіць, з чым прыйшлося сутыкнуцца іх аднагодкам, каб проста выжыць у гэтых антычалавечых умовах.

Сёння, калі беларуская нацыя знаходзіцца ў практычна дэзарыентаваным стане, стоячы на заблытаным раздарожжы, мы можам убачыць вынік той жудаснай трагедыі, якая адбылася 70 год таму, 29 кастрычніка, а таксама ўсіх злачынстваў камуністычнай таталітарнай сістэмы на Беларусі. Выйсце з гэтага становішча можна знайсці толькі праз шлях да пакаяння. Зразумела, што немагчыма пры сённяшняй сітуацыі прымусіць несці адказнасць за кожнага нявінна закатаванага і забітага чалавека тых нелюдзей, што спрычыніліся да злачынстваў. Таму шлях да пакаяння павінен прайсці ўвесь народ, каб будучыя пакаленні ў сваёй гісторыі не перажылі той трагедыі, якую бачыла Беларусь падчас існавання злачыннага сталінскага таталітарнага рэжыму. Мы, моладзевы нацыянальны рух Малады Фронт, ад імя ўсёй незалежнай беларускай моладзі, заклікаем беларусаў 29 кастрычніка ўшанаваць памяць нявінных ахвяраў камуністычнага тэрору. Сёння, праз 70 год пасля трагедыі, гэта з'яўляецца абавязкам кожнага неабыякавага і сумленнага чалавека перад нашай краінай, нашымі продкамі, а галоўнае,- перад будучымі пакаленнямі нашых нашчадкаў...

***Аляксей Янушэўскі***





СВІНЦОВАЯ ЗАМЯЦЬ



# У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. іх жыцці забрала свінцовая замяць...

**29 кастрычніка 1937 года толькі ў Мінскай турме НКВД расстраляна не менш за 70 чалавек (праўдападобна, больш за 100). І заўважце каго! Дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, навукоўцы, літаратары, работнікі асветы. Ніколі ні раней, ні пазней такога адсеву не рабілася. Вынішчалі эліту беларускай інтэлігенцыі, мозг нацыі. Вынікі таго расстрэлу мы адчуваем нават цяпер, праз 70 гадоў! Страх, што ўеўся ў нашы гены, душыць, як пятля, сціскае нашыя шыі, не дае дыхаць...**

**У жніўні таго юбілейнага для бальшавікоў 1937-га іх гвардзейцы-энкавэдысты пачалі татальнае вынішчэнне інтэлектуальнай беларускай эліты. Толькі за тры восеньскія месяцы паслугачамі таталітарнага рэжыму было рэпрэсавана больш за 600 грамадскіх і культурных дзеячаў Беларусі. За перыяд жа так званага крывавага тунэля смерці (жн. 1937 — снеж. 1938) расстраляна не менш за дзесяць тысяч чалавек.**

*З кнігі Л. Маракова «Ахвяры і карнікі».*

## РАССТРАЛЯНЫЯ Ў НОЧ З 29 НА 30 КАСТРЫЧНІКА 1937 ГОДА

АРАБЕЙ Мікалай Лявонцевіч, 1899 года нараджэння, Вялікая Вобрына Карэліцкага раёна.

АЎГУСЦІНОВІЧ Анатоль Ільіч, 1904, Орша, начальнік упраўлення пры СНК БССР.

АФАНАСЬЕЎ Ігнат Ільіч, 1888, Гарадзечна Мсціслаўскага, выкладчык Белпедтэхнікума.

БАРЗУНОЎ Георгій Фёдаравіч, 1904, Тульская вобл., дырэктар трэста Галоўхлеб БССР.

БАШКЕВІЧ Вадзім Ігнатавіч, 1904, Гарадок Мінскага, нач. Упраўлення вышэйшай школы наркамасветы БССР.





БРАНШТЭЙН Якаў Анатолевіч, 1897, Бельск, Падляшша, праца ў Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР.

БУРДЫКА Іван Сямёнавіч, 1900, Хутар Бярэзінскага, адказны сакратар СНК БССР.

ВАЙНОЎ Віктар Лявонцевіч (Лявонавіч), 1904, Палужжа Навагрудскага, журналіст.

ВАРОНЧАНКА Аляксандр Аўксенцевіч, 1905, Чэрыкаў, наркам асветы БССР.



ВОЛЬНЫ Анатоль, 1902, ст. Пухавічы, пісьменнік.



ГАЛАВАЧ Платон Раманавіч, 1903, Пабокавічы Бабруйскага, пісьменнік.

ГЕРШОН Іосіф Хаймавіч, 1900, бабруйск, намеснік наркама асветы БССР.



ПОШТА

**Добры дзень, Васіль Цімафеевіч! У мяне да Вас просьба. Калі можна, надрукуйце ў бюлетэні «Рэха ГУЛАГу» ліст ад майго бацькі, вязня ГУЛАГу, ад XI.1939 года. Напэўна, гэта быў апошні ліст ад бацькі, больш мы ўжо ад яго лістоў не атрымлівалі. Маці мая яго вельмі берагла, перадала мне і я яго збярог; калі буду паміраць, перадам яго сваім дзецям і ўнукам.**

Мне ўжо 81 год. Жыццё маё скора закончыцца і хочацца, каб засталася якая памяць аб маім бацьку. Багата ахвяр сталінскіх рэпрэсій не ўключылі ў спіскі кніг «Памяць», каб паменшыць колькасць. Не ўключылі і ў кнігу «Памяць» Брагінскага раёна Гомельскай вобласці рэпрасаваных і з маёй вёскі Вялімаў і другіх вёсак Калыбанскага сельсавета. Я дасылаў у Аргкамітэт Ларысе Андросік спісы ахвяраў сталінскіх рэпрэсій з трох кніг «Памяць», якія ў мяне маюцца: Брагінскага раёна, Кастрычніцкага (Акцябрскага) і Рагачоўскага.

Бацьку арыштоўвалі два разы. Першы раз вясной 1933 года. Перад гэтым, зімой, ён на калгасным сходзе, які праводзіў упаўнаважаны з райкама ды патрабаваў здаць на мяса валоў (у тыя часы асноўную цяглавую сілу) і завесці трусоў, бацька не вытрымаў, устаў і прамовіў: «Таварыш, а на чым жа мы вясной араць будзем, запрагаць у ёрма трусоў?» Падняўся рогат. Упаўнаважаны гэты адпомсціў бацьку, данёс у органы, і яго арыштавалі, далі тры гады высылкі. Ён яе адбываў у Казахстане ў Семіпалацінску, на якойсьці будоўлі.

А нас у тую ж вясну раскулачылі. Хату забралі, перавезлі на калгасны двор, забралі ўсю жывёлу і маёмасць. Бацька жыў са сваім бацькам Якімам у адной сям'і. Я добра памятаю той дзень. Бегаў я дзесьці, гуляў з сябрамі ў дзіцячыя гульні. Калі прыбег дамоў, убачыў у сваім двары багата падвод, на якія грузілі нашу маёмасць; авечкі і свінні вельмі верашчалі, а хату раскрывалі, скідвалі салому і ачарот. Памятаю, як ад авечак засталося ягнятка, якое я дагледаў, карміў травой, але яно без вымені здохла, і я па ім плакаў. Дзядуля мой з разбуранага кубла паехаў на Украіну, адкуль ён быў родам, шукаць сваіх родзічаў і знаёмых, але ў 1933 г. на Украіне быў вялікі голад, ён вярнуўся восенню хворы на дызентэрыю і памёр, хоць яму было толькі 69 гадоў і да раскулачвання ён быў моцны, дужы, выкашваў на балоце па гектару сенажаці і падымаў нагой двухпудовую гіру. А бацька яго, Апанас, мой прадзед, памёр ад чаду — не па хваробе — у 97 год.

Вось так раскідвалі і губілі працавітыя сялянскія сем'і.

Маці тры гады скіталася з намі па чужых хатах. Нас лішылі праў, былі лішэнцамі, адабралі прысядзібную зямлю. Карміла нас, траіх (трэці — пляменнік бацькаў, сірата) дзяцей, тым, што дадуць вясковыя жанчыны, у якіх яна працавала. Дапамагала апрацоўваць агароды, мыла бялізну, прала і ткала ім кросны.

Бацьку далі высылку, улічылі, што ён быў удзельнікам грамадзянскай вайны, быў паранены на вайне і не бачыў на адно вока, а так бы загналі ў лясы на павал. Вярнуўся ён са ссылкі ў 36-м годзе. Нас прынялі ў калгас. Бацька за кажухі, якія захавала бабуля, калі нас раскулачвалі, купіў у лесніка зрубхатку на тры акенцы. Летам 1937 года памятаю, ён браў мяне ў калгасны лес, дзе мы спілілі асінкі на кроквы для крышы і латы. Ехалі на падводзе, нагружанай гэтай драўнінай, бацька ішоў, а я сядзеў на возе. Пачалася навальніца, і бацька скінуў з сябе латун і прыкрыў мяне. Бацька ўспеў навесці крышу, зляпіў печку, уставіў вокны, гатова была хатка для зімы. Але не давялося яму пажыць у ёй.

У ліпені 1937 года, памятаю, раніцаю бацька забіваў дошкай каля дымаводнай трубы шчыліну. Прыйшоў у хату якійсьці незнаёмы. Спытаў: «Гэта вы Старахатні Міхаіл Якімавіч?» Бацька адказаў: «Я». «Вы арыштаваны. Збірайцеся.» Маці сабрала яму ў торбу што было з ежы і бялізну. На вуліцы стаяла палутарка, у кузаве сядзела чалавек з дзесяць арыштаваных з вёскі Калыбань, нашай суседняй, і стаяў вясковец з вінтоўкай з адкідным штыком. Бацька залез на машыну. Маці з плачам, я і сястра беглі да машыны. Машына кранулася, паехала. Я пабег след, ухапіўся рукамі за борт, крычаў «татачка». Па маіх руках стукнуў ахраннік і я ўпаў у дарожны пыл. Гэта было апошняе, што я памятаю аб сваім бацьку і да самай смерці ўжо не забуду.

У тую ноч з вёскі Калыбань арыштавалі 17 чалавек, асабліва пабралі ўсіх тых, хто яшчэ жыў на хутарах і не ўступіў у калгас. Амаль усіх іх расстралялі ў Гомелі (напэўна, у тым месцы, аб якім вы пішаце ў 4-м нумары «Рэха ГУЛАГу»). Толькі некаторым тройка дала па 10 гадоў, і ніхто з іх не вярнуўся, у тым ліку і мой бацька.

Цяпер прайшло ўжо 70 гадоў з таго жудаснага часу, і ўлады нашай краіны не хочуць, каб у падручніках школьных па гісторыі вывучалі, што адбывалася ў часы сталінізму, а наадварот, усхваляюць Сталіна і яго паплечнікаў, будуюць мемарыяльныя «Лініі Сталіна». Багата робіцца для таго, каб зноў адрадзіць культ кіраўніка дзяржавы, зрабіць яго самым «мудрым», як Сталін. Але ж ён быў палачом народаў Савецкага Саюза.

### Из письма отца — Старохатнего Михаила Акимовича

*Здраствуйте мое дорогое семейство и дорогая моя жена Мария.*

*Я пока жив-здоров и посылаю свое нижайшее почтение дорогой жене Марии и дорогому своему сыночку Акимчику и дочечке Надьке.*

*Низко кланяюсь и тысячу раз целую.*

*Ни на минутку не могу забыть я вас.*

*Что вы мне не напишете?*

*Я уже от вас не получаю сведений 11 месяцев и не знаю, как вы там.*

*Дорогой мой сынок, если получите письмо, напиши своей ручкой, ты же грамотный. Не забывай на меня несчастного.*

*Мне очень скучно.*

*Я работаю на повале леса.*

*Живем мы в лесу, как звери.*

*Здесь уже зима. Снег выпал 26 сентября.*

*Одежда у меня очень плохая, так что страшно зимовать. Очень холодно.*

*Передайте почтение дорогим сродственникам моим, братовой и племянникам, куму, куме и хресникам.*

*Просьба, не забывайте на меня.*


Адрес
Кировская Ж.Д.
257-5 Старохатнему

Отец долго не получал от нас писем наверное потому, что наши письма ему не отдавали. Наверное, ему было ограничено право на переписку. Может, одно или два письма на год.

В архивной справке из Гомельского КГБ указано, что отец умер 1 апреля 1940 года.

А в Ухтинской (этот архив я нашел благодаря публикации Радима Горецкого «У край «шчаслівага» дзяцінства» в «Народной воле») сказано, что отца в феврале 1940 года перевели из этого лагеря на строительство в г. Кандалакшу и умер он 1 июля 1940 г. В этой справке больше правды, но причина смерти и здесь не правдивая. Скорее всего, узников, строивших этот объект в Кандалакше (я узнал, что там строился какой-то секретный военный объект), расстреляли.

С низким поклоном к Вам!

***А.Старахатні**, 25.09.2007 г.*

## СВІНЦОВАЯ ЗАМЯЦЬ



ХАРЫК Ізі (Ісаак Давыдавіч), 1896, Зембін Барысаўскага, паэт.

* * *

*Адсюдь крычу я сэрцам і душою*
*Наступнага далёкім жыхарам:*
*Хай сённяшняе нашае, зямное*
*Жыццё-быццё не здасца цудам вам.*

*Далёка там, у прышласці шчаслівай,*
*Шукаць для нас не ўздумайце акрас,*
*Не аздабляйце лірыкай гуллівай,*
*Легендамі не карануйце нас!*

*Не карануйце нашыя галовы*
*Карункамі, сатканымі з святла...*
*Мы тут былі, мы тут жылі сурова,*
*І праўда нас суровая вяла.*

*Мы першыя цаглiны закладалі,*
*І кожны ў мур цаглінай лёг жывой...*
*Мы ўсе да болю ў сэрцы смуткавалі*
*Аб пары крыл мяцежных за спіной.*

*Праз пыл руін мы крочылі калонай,*
*З'яднаныя ў адзіную сям'ю...*
*І суджана яшчэ адно было нам —*
*Пакінуць з песняй гэтую зямлю.*

*Таму і шлю без смутку, без тугі я*
*Ад нас, ад акрываўленых, наказ...*
*Адсюль крычу я ў заўтра:*
*— Дарагія,*
*Крылатыя, не карануйце нас!*

Ізі Харык. 1925



ХАТУЛЁЎ Пятро (Пётр Фёдаравіч), 1912, Віцебск, літаратурны крытык.



ЧАРНУШЭВІЧ Аляксандр Анікеевіч, 1899, Капыль, партыйны і дзяржаўны дзеяч, наркам асветы.



ЧАРОТ Міхась (Кудзелька Міхась Сымонавіч), 1896, Рудзенск Пухавіцкага, пісьменнік.

* * *

Зазвані моцна звон,
загудзі,
Каб пачулі цябе на ўвесь
край,
Беларуса хутчэй разбудзі,
Хоць цяпер яму спаць
ты не дай!

Прыйшоў час, калі сорамна
спаць,
Усе так шчыра за працу
ўзяліся,
Усе жыццё пачалі
будаваць,
А ты спіш... Хоць ад
звону прасніся!

Паглядзі, як сусед пачаў
жыць,
Што нядаўна нявольнікам
быў,
Ён не спаў, — і цяпер ён
не спіць,
Усім кажа, што ён яшчэ
жыў.

А чаго, беларус, ты маўчыш?
І табе годзе, братку,
драмаць:
Калі можна гукаць —
ты маўчыш,
Каб пасля не прыйшлось
шкадаваць.

Кінь саромецца мовы сваёй,
Зваць сябе беларусам
пачні,
Папрацуй над сядзібай
сваёй,
А пасля з ціхатой адпачні!

Дык звані моцна звон
і гудзі,
Сваім гукам глушы
увесь край!
Хто 'шчэ спіць — ты таго
разбудзі,
Хто не спіць — тых
да працы збірай!

* * *

***Я не чакаў***
***І не гадаў,***
***Бо жыў з адкрытаю душою,***
***Што стрэне лютая бяда,***
***Падружыць з допытам,***
***З турмою.***

***Прадажных здрайцаў ліхвяры***
***Мяне заціснулі за краты.***
***Я прысягаю вам, сябры,***
***Мае палі,***
***Мае бары, —***
***Кажу вам — я не вінаваты!»***

**Міхась Чарот**

Апошні верш паэта. Ён напісаны на сцяне турэмнай камеры.



ШАЛАЙ Макар (Шалаеў Макар Ксенафонтавіч), 1906, Цельцы Расонскага, літаратурны крытык.

ШАСТАКОЎ Павел Пятровіч, 1899, Манастыршчына Магілёўскай (цяпер Смаленскай вобл.), жырналіст, выклвдчык беларускай мовы і літаратуры, рэдактар «Савецкай Беларусі», «Калгасніка Беларусі», нам. наркама асветы БССР.



ЮДЭЛЬСОН Арон Ісакавіч, 1907, Рыга, паэт, нарысіст.



## СВІНЦОВАЯ ЗАМЯЦЬ

ДЗЕНІСКЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч, 1904, Закаблукі Мінскага, другі сакратар ЦК КП(б)Б.



ДЗЯКАЎ Ананій Іванавіч, 1896, Багданаўка Мсціслаўскага, рэктар БДУ, наркам асветы.



ДУДАР Алесь (Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч), 1904, Навасёлкі Петрыкаўскага, паэт.

* * *

***Пасеклі наш край папалам,***
***Каб панскай вытаргаваць ласкі.***
***Вось гэта — вам, а гэта нам,***
***Няма сумлення ў душах рабскіх.***

***І цягнем мы на новы строй***
***Старую песню і чужую,***
***Цыгане шумнаю талпой***
***Па Бесарабіі качуюць...***

***За ўсходнім дэспатам-царком***
***Мы бегаем на задніх лапках,***
***Нью-Йорку грозім кулаком***
***І Чэмберлена лаем трапна.***

***Засыплем шапкамі яго,***
***Ура, ура, патопім ў соплях.***
***А нас, тым часам, з году ў год***
***Тут прадаюць у разброд і оптам.***

***Мы не шкадуем мазалёў.***
***Мы за чужых праклёны роім,***
***Але без торгу і без слоў***
***Мы аддаем сваіх герояў.***

***Не смеем нават гаварыць***
***І думаць без крамлёўскай візы.***
***Без нас ўсё робяць макляры,***
***Ды міжнародныя падлізы.***

***Распаўся б камень ад жальбы,***
***Калі б ён знаў, як торг над намі***
***Вядуць маскоўскія рабы***
***З вялікапольскімі панамі.***

***О, ганьба, ганьба! У нашы дні***
***Такі разлом, туга такая! ...***
***І баюць байкі баюны***
***Северо-западного края...***

***Плюююць на сонца і на дзень.***
***О, дух наш вольны, дзе ты, дзе ты?***
***Ім мураўёўскі б гальштук ўдзець,***
***Нашчадкам мураўёўскім гэтым...***

***Але яшчэ глушыце кроў.***
***Гарыць душа і час настане.***
***Калі з-за поля, з-за бароў***
***Па-беларуску сонца гляне.***

***Тады мы ў шэрагах сваіх***
***Быць можа шмат каго не ўбачым.***
***З тугою ў сэрцы ўспомнім іх,***
***Але ніколі не заплачам.***

***А дзень чырвоным зацвіце***
***І мы гукнём яму «Дабрыдзень».***
***Ці са шчытом, ці на шчыце***
***Ў краіну нашу зноў мы прыдзем.***

А. Дудар



ДУНЕЦ Хацкель Майсеевіч, 1897, Слонім, літаратар.

ЖЫВУЦКІ Іван Сцяпанавіч, 1912, Зарэмец Бярэзінскага, настаўнік.



ЗАРЭЦКІ Міхась (Касянкоў Міхаіл Яўхімавіч), 1901, Высокі гарадзец Талачынскага, пісьменнік.

ІСПРАЎНІКАЎ Прохар Іванавіч, 1902, Трыбылінцы пад Веліжам, журналіст газеты «Віцебскі пралетарый».

КАВАЛЁЎ Захар Ціханавіч, 1900, Узлогі Хоцімскага, сакратар Варашылаўскага РК КП(б)Б у Мінску.



КАВАЛЬ Васіль (Кавалёў Васіль Пятровіч), 1907, Сава Горацкага, пісьменнік.

КАВАЛЬЧУК Захар Захаравіч, 1893, Крыўляны Жабінкаўскага, дырэктар рыбна-кансервавага завода.

КАНДРАШУК Мікалай Фёдаравіч, 1897, Скідзель, начальнік Упраўлення шкляной прамысловасці.

КАНТАР Саламон Мендзелевіч, 1894, Горкі, дырэктар Белпрамганлю.



КАРАНЕЎСКІ Язэп (Іосіф) Пятровіч, 1888, Заслаўе, рэктар БДУ, нам. дырэктара Інстытута чырвонай прафесуры (Масква).

КАРПЕНКА Іван Іванавіч1905, Парычы, заг. лабараторыі Віцебскай ветэрынарнай станцыі.



КЛЯШТОРНЫ Тодар Тодаравіч, 1903, Парэчча Лепельскага, пісьменнік.

* * *

*Ўпрадае дым у залатую гладзь*
*Па-над прасторамі бярозавая просінь,*
*Ружовы дзень спусціўся падрамаць*
*За верхавінамі смалістых сосен.*

*Мядовы водар кружыць галаву...*
*У ціышыні задумаліся далі.*
*Рамонкі белыя аснежылі траву*
*І ў туманох салодка задрамалі.*

## СВІНЦОВАЯ ЗАМЯЦЬ

*О, родны край, саломенныя хаты...*
*Люблю прастораў казачную муць.*
*Іду адзін,*
*А тысячы крылатых*
*Мне пра любоў адвечную пяюць.*

*Тут паланецъ душа не перастане,*
*Тут не астыне ў жылах кроў...*
*Тут кожны крыж — адвечнае змаганне,*
*Тут кожны куст — адвечная любоў...*

*О, тут усё...*
*Так хочу жыць і верыць,*
*Аддаць душу прыгожасці палёў,*
*Гатоў скакаць вясёлым піянерам*
*Пад залатыя гуслі салаўёў.*

*Па-над прасторамі*
*Бярозавая просінь,*
*Упрадае дым у залатую гладзь*
*За верхавінамі смалістых сосен.*
*Ружовы дзень спусціўся падрамаць.*

* * *

*Белыя паляны, белыя гаі...*
*Пчолы ледзяныя кружацца ў галлі,*
*Кружацца раямі, сыплюцца на дол,*
*Апушылі хвоек срэбраны прыпол.*

*А з-за лесу-гаю скача па лугах*
*Хтосьці незнаёмы ў ледзяных санях.*
*З сіняватых даляў, з сіняватай цьмы*
*Хтосьці напявае залатыя сны.*

*Хай галосяць ветры ў цемені начной,*
*Сядзем, дарагая, пасядзім з табой.*
*Раскажы мне шчыра, праўду раскажы, —*
*Хто ў чароўных вочах зоры патушыў?!*

*Хто замёў снягамі у душы вясну?*
*Сэрца хто параніў — вымеў цеплыню?!*
*Хто распяў з каханнем сэрца на крыжы,*
*Раскажы мне праўду, любая, скажы?!*

*І маўчаць пацёмкі... любая маўчыць....*
*Ледзянеюць словы, і душа баліць...*
*Белыя паляны, белыя гаі,*
*Пчолы ледзяныя кружацца ў галлі.*

*І мярцвеюць змрокі між сівых завей,*
*Прытуліся бліжай, сэрца абагрэй...*

Тодар Кляшторны

КУДЗЕЛЬКА Іосіф Фадзеевіч, 1894, Рудзенск Пухавіцкага, нач. Упраўлення па ахове аўтарскіх правоў.



КУДЗЕЛЬКА Іван Фадзеевіч, 1891, Рудзенск Пухавіцкага, наркам фінансаў БССР.



КУЛЬБАК Майсей Саламонавіч, 1896, Смаргонь, пісьменнік.

КУЧЫНСКІ Аляксей Сцяпанавіч (Стафанавіч), 1892, Выдранка Краснапольскага, нам. Рэдактара «Савецкай Беларусі», в.а. рэктара БДУ.

ЛАБАДАЕЎ Міхаіл Гаўрылавіч, 1905, Слаўгарад, нам. першага сакратара ЦК КП(б)Б.

ЛАШКЕВІЧ Леанард Янавіч, 1899, Рыга, нам. наркама саўгасаў БССР.



ЛЕВІН Саламон Вульфавіч, 1912, Ратамка Мінскага, настаўнік, літаратурны крытык.



ЛЯВОННЫ Юрка (Юркевіч Леанід Мікалаевіч), 1908, Чавусы, пісьменнік.

ЛЯМПЕРТ Саламон Рыгоравіч, 1916, Мінск, студэнт гістарычнага факультэта.

ЛЯЎКОЎ Максім Архіпавіч, 1894, Кавалі Бабруйскага, наркам юстыцыі, сакратар ЦВК БССР, член ЦК КП(б)Б.

МАЗЕЛЬ Елізар Якаўлевіч, 1895, Палтава, нам. дырэктара Віцебскай навукова-даследчай ветэрынарнай Станцыі.

МАІСЕЕЎ Леў Абрамавіч, 1897, Веліж, сакратар Барысаўскага РК КП(б)Б.

МАЛАЎ Барыс Міхайлавіч, 1904, Мінск, служачы наркамата ўнутранага гандлю.



МАРАКОЎ Валерый Дзмітрыевіч, 1909, Козырава пад Мінскам, паэт.

### Жаданне

*Адыходзь, трывога, й забірай з сабой*
*Плач і крыўду хлопца з чулаю душой.*

*Ты адна сягоння мне свая між ніў,*
*Быццам я згараю ў песенным агні.*

*Быццам я далёка, ў вочы б'е туман,*
*І нічога светлага больш ў жыцці няма.*

*Ах, мой край каханы, залаты мой край!*
*Не хачу так рана ў песнях дагараць.*

*Я йшчэ жыў так мала і так мала пеў.*
*Ну дык дайце ж, братцы,*
*мне пажыць цяпер.*

*Дайце на прыволлі сэрца з сінню зліць,*
*Каб з другімі марыць і другіх любіць.*

Валерый Маракоў

МАРГЕЛАЎ Сцяпан (Стафан) Прохаравіч, 1902, Расохавічы Касцюкоўскага, прафесар Інстытута народнай гаспадаркі.

МАР'ЯНАЎ Барыс Лазаравіч, 1894, Татарск Смаленскай вобл., сакратар Дзяржынскага РК КП(б)Б.

МІХАЙЛАЎ Дзям'ян Мацвеевіч, 1905, Хоцімск, кансультант Упраўлення справамі СНК БССР.

МІЦЬКОЎ Сяргей Рыгоравіч, 1896, з Дзісненшчыны, дырэктар Гідролізнага вопытнага завода.



МУРЗО Сяргей Мікітыч, 1912, Масква, паэт, настаўнік.



СВІНЦОВАЯ ЗАМЯЦЬ

МУХІН Павел Максімавіч, 1907, Забалоцце Барысаўскага, заг. Лабараторыі Віцебскай н.-д. Ветэрынарнай станцыі.



НЁМАНСКІ Янка (Пятровіч Іван Андрэевіч), 1890, Шчорсы Навагрудскага, пісьменнік, грамадскі дзеяч.

ПЕТРУШЭНЯ Васіль Аляксандравіч, 1904, Сінягова Старадарожскага, кансультант СНК БССР.



ПІВАВАРАЎ Зяма (Залман Рувімавіч), 1910, Касцюковічы, паэт.

ПРАТАСЕНЯ Рыгор Іванавіч, 1899, Сенніца Слуцкага, аграхімік, нам. дырэктара Інстытута аграглебазнаўства.



РЫДЗЕЎСКІ Міхаіл Антонавіч, 1885, Рэчыца Гомельскай, дырэктар Белпедтэхнікума, заг. вучэбнай часткі Мінскага вышэйшага педінстытута.

САНДАМІРСКІ Якаў Рыгоравіч, 1902, Крамянчуг, заг. Кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута.



САПРЫЦКІ Аскар Абрамавіч, 1894, Халочча Рагачоўскага, нам. наркама земляробства БССР.

СПЕКТАР Якаў Меерavіч, 1891, Копысь Аршанскага, заг. Сакратарыята СНК БССР.



СТАШЭЎСКІ Васіль Пятровіч, 1895, Свінка (Лугавая) Капыльскага, пісьменнік.

СЯЛОЎ Дзмітрый Паўлавіч, 1896, Яраслаўская вобл., фінансіст Упраўлення наркамата асветы БССР.

СЯРДЗЮК Панцялей Іванавіч, 1907, Азоўска-Чарнаморскі край, заг. лабараторыі біяфабрыкі № 5 у Віцебску.



ТАЎБІН Юлій (Юдаль Абрамавіч), 1911, Варонежская вобл., паэт.

### На усходзе нашага жыцця...

Змітраку Астапенку
і Аркадзю Куляшову

*На ўсходзе нашага жыцця,*
*Калі усход гарэў над намі,*
*Мы йшлі пад маладосці сцяг*
*Неабвузданымі хлапцамі.*

*Ці быў пад намі пыльны брук*
*І гарадоў дарожны камень,*
*А ці рамонкавы абрус, —*
*Адну мы радасць спатыкалі.*

*І будзем дзякаваць зары,*
*Пакуль жыццё у нас не згасне,*
*За тайны творчае пары,*
*За гэта радаснае шчасце.*

*І будзем мы ў жыцця прасіць*
*У неперажытыя нягоды,*
*Каб зноў маглі мы перажыць*
*Адзінай маладосці годы.*

*Каб жыў у сэрцы кліч завей,*
*Каб мы жылі адным запалам,*
*Каб вогнішча былых надзей*
*Ніколі ў нас не пагасала.*

*Зара разгорне горды сцяг*
*У апошні раз калісь над намі —*
*Мы ўспомнім проміны жыцця,*
*Калі мы ўсе былі хлапцамі.*

*І ў ціхім шолаху дуброў,*
*І ў прывітанні згукаў дальніх*
*Пачуем гамы дзіўных строф*
*Для нашых песень развітальных.*

*Вясёлы вецер для другіх*
*Пачне вагаць такія ж пожні,*
*І праспяваем мы для іх*
*Сваёю песняю апошняй.*

Юлій Таўбін. 6.1.1930, Мсціслаўль

Ніжэй друкуецца верша англійскага паэта А. Хаўсмана «Законы бога й людзей» у перакладзе Ю. Таўбіна. Гэта як бы пасланне з таго свету.

* * *

*...Себе другой избрал я путь —*
*Они хотят меня вернуть.*
*Но я, хуля законы их,*
*Им не навязывал своих.*
*Мол, как угодно, господа, —*
*Раз вы туда, так я сюда.*
*Так нет же! Им стерпеть нельзя,*
*Что у него своя стезя.*
*Они грозят — иди назад,*
*Не то — тюрьма, петля и ад.*
*Как не робеть мне! Суд их скор.*
*Могу ль вступить в неравный спор?*
*Не я построил этот мир.*
*Я в нем блуждаю, чужд и сир.*
*Хоть глупые, но господа —*
*Они. Их сила, их права.*
*А нам на Марс не улететь*
*С тобой, душа моя... Так впредь*
*Смирись и следовать сумей*
*Законам Бога и людей...*

ТУРЛАЙ Андрэй Аляксеевіч, 1894, Кракотка Слонімскага, наркам саўгасаў БССР.

УСПЕНСКІ Яўген Канстанцінавіч, 1891, Вільня, прафесар фізікі БДУ і Гомельскага педінстытута.

ФРЫДМАН Ісак Сямёнавіч, 1887, Сімферопаль, служачы наркамата земляробства.